# ГОРА, ЯКОЕ ЯДНАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У будаўніцтва, якое пачалося ў 2012 годзе, было ўкладзена больш за 400 тысяч рублёў бюджэтных сродкаў, спонсарскай дапамогі і ахвяраванняў, сабраных Беларускім фондам міру. Аб'ект планавалі здаць на працягу шасці месяцаў. Аднак зараз ён гатовы менш чым на палову. Да таго ж работнікі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці, якія праводзілі там праверку, высветлілі, што пры ўзвядзенні мемарыяла завышаўся кошт работ, выкарыстоўваліся няякасныя матэрыялы. Напрыклад, плітка на ўжо гатовай Сцяне памяці дэфармавалася настолькі, што ледзь не абвалілася на зямлю.

Генеральны падрадчык па аб'екце прыцягнуў да субпадраду іншую арганізацыю. Але атэстатаў адпаведнасці ў яе не было. Менавіта субпадрадчык у 2016-м набываў плітку і іншыя будматэрыялы без узгаднення з заказчыкам, якія не кантраляваў работы, што праводзіліся на аб'екце. Гэта — адна з прычын, па якой Сцяна памяці ледзь не абвалілася яшчэ да адкрыцця мемарыяла.

Дарожкі з тратуарнай пліткі на мемарыяле таксама выканаль ненележным чынам. У асобных месцах плітка вышэй бардзюрнага каменя. Яе колер павінен быць цёмны, але пасля зімоўкі на паверхні выступілі бялявыя разводы ад солі. Ёсць адбітыя куткі і «ракавіны» — паглыбленні, якія ператварыліся ў пясок. Самыя разбураныя ўчасткі ўжо дэмантавалі.

Асобнае пытанне — як кошт работ на мемарыяле аказаўся завышаным на 57 тысяч рублёў? Таццяна Хітрова, намеснік старшыні Полацкага міжраённага Камітэта дзяржкантролю, каментуе гэта так: «Калі будматэрыялы набываюць за кошт бюджэту, недапушчальна перавышаць надбаўку ў 10 %. У нашым выпадку закупкі вяліся праз пасярэднікаў з перавышэннем гэтага парога. Да таго ж капліцу, якая будзе ўсталявана на мемарыяле, генпадрадчык умудрыўся падаць да аплаты двойчы».

У публікацыі адзначаецца, што вінаватых асоб знялі з пасад, а арганізацыі, якія неналежна выканалі работы, аштрафавалі. Але факт застаецца фактам — мемарыял недабудаваны, і грошай на заканчэнне работ на цяперашні момант усё яшчэ недастаткова. Тым не менш тыя, хто дагэтуль верыць, што мемарыял будзе дабудаваны, працягваюць шукаць спосабы сабраць сродкі такіх заўзятараў. Адзін з іх — **Максім МІСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, старшыня праўлення Беларускага фонду міру.** У яго з'явілася ідэя ўдзелу Фонду міру ў атрыманні гранта Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у $25 000, каб аддаць атрыманыя сродкі на завяршэнне работ.




**Удзельнікі канферэнцыі «Роля рэлігій у захаванні міру» ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.**

«У 2010 годзе Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, згодна з якой штогод кожны першы тыдзень лютага праводзіцца Сусветны тыдзень гарманічных міжканфесійных адносін паміж усімі рэлігіямі, веравызнаннямі і канфесіямі, — расказвае ён. — У Полацку будуецца мемарыял «Урочышча Пяскі», таму менавіта тут было вырашана правесці рэспубліканскую міратворчую канферэнцыю «Роля рэлігій у захаванні міру». Уся краіна збірае ахвяраванні на будаўніцтва мемарыяла, яно ўключана ў дзяржаўную праграму. Акрамя таго, усе канфесіі дапамаглі пералічыць грошы на будаўніцтва. Наша агульная задача зараз — дастойна, усім разам пахаваць загінулых тут людзей».

Важна, што неабыякавымі да наступстваў Вялікай Айчыннай вайны застаюцца і прадстаўнікі розных веравызнанняў Беларусі. Падчас свайго выступлення на канферэнцыі кіраўнік Фонду міру асобна звярнуўся да ролі канфесій у вырашэнні міждзяржаўных канфліктаў. «Сёння знешняя палітыка — гэта не толькі адносіны паміж дзяржавамі. Вялікую ролю адыгрываюць і грамадзянскія супольнасці, а значыць, і рэлігійная. Больш за 80 % людзей у свеце належаць да пэўнай рэлігіі. Рэлігійныя супольнасці маюць значны ўплыў, — лічыць Максім Місько. — Рэлігіі могуць і павінны браць на сябе адказнасць у вырашэнні многіх канфліктаў. Выкарыстоўваць рэлігійны патэнцыял неабходна. І гэтаму доказ — праведзеная канферэнцыя».



**Так па праекце павінен выглядаць мемарыяльны комплекс.**

Адна з задач Фонду міру — дапамагаць збіраць грошы, мабілізоўваць сродкі для міратворчых праектаў. Калі ў конкурсе на тое, хто лепей правядзе мерапрыемства ў Сусветны тыдзень, ідэя з міжканфесійнай канферэнцыяй перамога, то $25 000 гранта, ці каля 50 000 рублёў, пойдуць на будаўніцтва мемарыяла. «За гэтыя грошы мы маглі б паставіць уваходны партал і давесці астатнія работы да ладу. На сёння амаль 150 000 рублёў ужо ёсць. Атрыманыя ад гранта грошы амаль цалкам пакрылі б неабходныя расходы», — тлумачыць Максім Місько. Але, як высветлілася пазней, у ААН у атрыманні гранта Беларускаму фонду міру адмовілі.

Для **Наталлі ГУЙВІК, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве**, недабудаваны мемарыял — асабісты боль. Ужо шмат гадоў яна — ініцыятар належнага пахавання ва ўрочышчы. І станоўча ставіцца да таго, што з дапамогай далучыліся і прадстаўнікі веруючых супольнасцяў. «Ва «Урочышчы Пяскі» пахаваны савецкія воіны ўсіх канфесій. У 52-ю савецкую армію ўвайшлі байцы самых розных нацыянальнасцяў — башкіры, удмурты, рускія, татары. Яны амаль усе трапілі ў палон», — расказвае парламентарый.

Па словах дэпутата, ёсць ваенны пашпарт, які пацвярджае, што ў гэтым месцы пахавана больш за 38 тысяч ваеннапалонных, бо тут з-за пяскоў гэта рабіць было вельмі зручна. Ва ўрочышчы было знойдзена дзевяць ямін, з якіх дзве цалкам спалены: немцы спрабавалі знішчаць сведчанні сваіх злачынстваў, калі адыходзілі. Дакументальна вядома 102 прозвішчы загінулых, што і адлюстравана на Сцяне памяці. Побач з ёй ляжыць пліта, на якой выбіты чатыры рэлігійныя сімвалы. Прозвішчы даказваюць, што ў пясках пахаваны людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў.

Пакуль мы разам з удзельнікамі канферэнцыі дабіраліся да мемарыяла, Наталля Васілеўна не раз адзначыла, што калі работы будуць скончаны, то з'явіцца ўзяная дарога са святлом і ўваходны партал, і абеліск, і плітка... «Інфляцыя пастаянна з'ядае грошы. Таму мы пайшлі на тое, каб паменшыць кошт мемарыяла: уваходны партал у выглядзе крыжа будзе выглядаць больш сціпла. Ужо 50 000 рублёў пайшло на будаўніцтва капліцы. У 2010 годзе, калі мы пачалі ўзводзіць мемарыял, кошт праекта быў усяго мільярд недэнамінаваных рублёў. Здавалася, што мы ўсё даробім за год. У тым жа 2010-м мы сабралі вельмі вялікую суму дзякуючы рэспубліканскаму суботніку ў Полацку, і нават яшчэ жывыя сведкі тых падзей пералічвалі па мільёне недэнамінаваных рублёў. У 2011 годзе ўпаў рубель, і пачаліся праблемы. І таму так доўга спрабуюць прывесці ўрочышча ў належны стан», — тлумачыць Наталля Гуйвік.

Дэпутат заклікала ўсіх і асабліва палачан паўдзельнічаць у будаўніцтве мемарыяла. Тым больш што сёлета — Год малой радзімы. «Нам бы хацелася, каб на гэтым месцы моладзь праводзіла патрыятычныя мерапрыемствы: каб тут прымалі ў піянеры, у Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, праводзіліся ваенныя прысягі, малебны. Усё, што мы робім, — гэта дзеля міру на зямлі і дзеля будучыні нашай моладзі», — кажа парламентарый.

**Вераніка ПУСТАВІТ,**
*Мінск — Полацк — Мінск.*

**Нягледзячы на ўсе складанасці, збор сродкаў працягваецца. Грошы на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі» ў Полацку можна пералічыць на дабрачынны рахунак IBAN № BY75BLBB31350300126737001003 (у беларускіх рублях) дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк» па Віцебскай вобласці, код (BIC) BLBBBY2X, УНП 300126737, АКПА 05836097; рахунак IBAN IBAN № BY21BLBB31350300126737001005 (у расійскіх рублях) у дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк» па Віцебскай вобласці, код (BIC) BLBBBY2X, Рэспубліка Беларусь, 210015, г. Віцебск, вул. Леніна, 22.**

**На сайце Беларускага фонду міру fondmira.by можна прасачыць за тым, колькі грошай паступіла на рахунак і як яны размяркоўваюцца.**

# «МУЗЕЙ-БУС» АДПРАВІЦЦА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Экспазіцыю незвычайнага музея складуць экспанаты, якія сведчаць пра гераізм беларускага народа і гісторыі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У прыватнасці, у інтэрактыўную выставу ўвойдуць арыгінальныя артэфакты



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Акуляры віртуальнай рэальнасці дапамагаюць наведвальнікам музея перанесціся ў мінулыя часы.**

часоў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама макеты і муляжы зброі, элементы рыштунку, амуніцыі і ваеннай уніформы, калекцыя галаўных убораў, прадметы ваеннага побыту, дакументы і ўзнагароды ўдзельнікаў тых далёкіх ваенных падзей. Таксама на выставе можна будзе ўбачыць сапраўдны патэфон, рарытэтныя пласцінкі з савецкімі даваеннымі і пасляваеннымі песнямі, унікальную карту-схему аператыўнай абстаноўкі пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны, выкананую ўручную беларускім навукоўцам-археолагам Уладзімірам Ісаенкам, рэдкую літаратуру з разнастайным картаграфічным матэрыялам з серыі «Бібліятэчка афіцэра» і многае іншае.

Ваенную экспазіцыю гарманічна дапоўняць сучасныя тэхналогіі: «віртуальная кіназала» са зручнымі крэсламі-трансформермі і акулярамі віртуальнай рэальнасці. Стаць сведкамі жывой гісторыі на свае вочы ў фармаце 360° дапаможа троххвілінны фільм-успамін пра падзеі Другой сусветнай вайны ў панарамным фармаце. Ён створаны ў рамках ініцыятывы «Памятаем усё» беларускай кампаніяй Wargaming сумесна з ваенна-патрыятычным паркам «Патрыёт». Дарэчы, прагледзець кароткаметражку з удзелам рэальных герояў, ветэранаў-танкістаў, у «віртуальнай кіназале» адначасова змогуць чатыры чалавекі.

8 мая з 12.00 экспазіцыю музея можна наведаць каля Цэнтральнага Дома афіцэраў, а з 14.00 — на Кастрычніцкай плошчы.



**Каля стэлы «Мінск — горад-герой» удзельнікі Калінкавіцка-Мазырскага ваенна-гістарычнага клуба «Пошук» Юлія ЛАГУН, Ян МІХАЛЕНЯ, Уладзімір ГІМБУТ.**

Нагадаем, «Музей-бус «Кветкі Вялікай Перамогі» з'яўляецца неад'емнай часткай і адным з цэнтральных мерапрыемстваў рэспубліканскага патрыятычнага праекта «Кветкі Вялікай Перамогі». Гэтая маштабная сацыяльная акцыя, скіраваная на яднанне беларусаў, сімвалам якой стала чырвона-зялёная стужачка з яблыневым цветам, рэалізуецца ў краіне з 2015 года па ініцыятыве Грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і з'яднала за гэтыя гады сотні тысяч жыхароў Беларусі розных узростаў і прафесій.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**